# ГРУНТОВЫ МОГІЛЬНІК МІЛАГРАДСКАЙ КУЛЬТУРЫ КАЛЯ В. БАРАВІКІ: НЕКАТОРЫЯ ГІСТАРЫЯГРАФІЧНЫЯ ПЫТАННІ

Алег Сахончык | аспірант кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

У артыкуле прадстаўлены матэрыялы помніка каля в. Баравікі. Помнік быў выпадкова адкрыты ў 1960 г., і абследаваны ў 1961 г. У. Ф. Ісаенка. Адзначаюцца пэўныя разыходжанні паміж тэкстамі публікацый, справаздачай і матэрыяламі якія захоўваюцца ў музеях. Адносна пахавальнага абраду выяўленых разбураных пахаванняў выказваюцца дзве думкі.

**Ключавыя словы:** *мілаградская культура, ранні жалезны век, пахавальны абрад, крэмацыя, кенатаф.*

Помнік мілаградскай культуры каля в. Баравікі (Мозырскі р-н Гомельская вобл.) (мал. 1, *28*) быў адкрыты ў 1960 г. настаўнікам сярэдняй школы в. Юравічы А. П. Гарчанка. Ім былі знойдзены фрагменты керамікі, якія археолагамі былі суаднесены з матэрыяламі мілаградскай культурай.

У 1961 г. месцазнаходжанне было абследавана У. Ф. Ісаенкам. Помнік размешчаны на левым беразе р. Прыпяць, на адлегласці 0,5–1 км на паўночны-ўсход ад в. Баравікі. Месціцца на невялікім узвышшы, якое абкружана з паўночнага-ўсходу балотамі і перыядычна пересыхаючай пратокай, а з захаду – дзюннай градой. Культурны слой быў моцна разбураны бульдозерам падчас дарожных прац. Даследчыкам праводзілася толькі зачыстка агаленняў (Исаенко, 1961, с. 36).

Інфармацыю пра месцазнаходжанне ў Баравіках апублікаваў Л. Д. Побаль (1983, с. 268; 1991, с. 73–74). Згодна з публікацыяй і тэкстам справаздачы, на ім былі выяўлены матэрыялы эпохі бронзы – ранняга жалезнага веку. На думку Л. Д. Побаля і У. Ф. Ісаенка, у раннім жалезным веку тут існаваў грунтовы могільнік мілаградскай культуры з пахаваннямі па абраду крэмацыі (Исаенко, 1961, с. 36–37; Побаль, 83, с. 268).

© *Алег Сахончык,* 2021




**Мал. 1.** Матэрыялы выяўленыя на помніку каля в. Баравікі:
*1* – сасуд са збору Нацыяльнага гістарычнага музея Беларусі (фота і малюнак аўтара);
*2* – сасуд, які захоўваецца ў Юравіцкай сярэдняй школы (фотаздымак М. М. Крывальцэвіча);
*3–4* – бранзалеты, якія захоўваюцца ў Юравіцкай сярэдняй школе (фотаздымак М. М. Крывальцэвіча)

На помніку былі выяўлены: 3 амаль цэлыя гліняныя пасудзіны, бранзалет са сплаву медзі, жалезны наральнік, а таксама паасобныя фрагменты керамікі. Знойдзены вышэй названыя прадметы разам, ці на пэўнай адлегласці адзін ад аднаго, у справаздачы не паведамляецца. Адзін сасуд быў перададзены ў Дзяржаўны музей БССР (мал. 1, *1*) (зараз Нацыянальна-гістарычны музей РБ), а астатнія прадметы – ў Юравіцкую сярэднюю школу (Калінкавіцкі р-н Гомельская вобл.).

На дадзены момант з матэрыялаў, сабраных у 1961 г. каля в. Баравікі захавалася два сасуды мілаградскай культуры: адзін ў фондах Нацыянальнага гістарычнага музея Беларусі (КП № 10600/18), другі ў музеі Юравіцкай школы*, дзе таксама захоўваюцца два бранзалеты. Згодна з тэкстам справаздачы жалезны наральнік рассыпаўся**.

---

* Выказваем шчырую ўдзячнасць М. М. Крывальцэвічу, вядучаму навуковаму супрацоўніку аддзела археалогіі першабытнагаму грамадства, кандыдату гістарычных навук за ласкава прадстаўленыя фотаздымкі матэрыялаў з Юравіцкай сярэдняй школы.

** Жалезны наральнік верагодней за ўсё не можа быць аднесены да мілаградскай культуры, дзе такія прылады працы невядомыя, невядомы яны і ў сінхронных культурах лясной і лесастэпавай зон (Лошенков, 2011, с. 292).

Мініяцюрны гаршчок (мал. 1, *1*), захаваўся амаль поўнасцю. Невялікія страты ў верхняй частцы і па тулавы. Акругладонны, тулава выцягнутай акруглай формы, з найбольшым расшырэннем у сярэдняй частцы. Дыяметр па венцы 10,8 см, дыяметр па аснаванню шыйкі 9,1 см, дыяметр найбольшага расшырэння тулава 11,5 см, вышыня 10,7 см, даўжыня шыйкі 1,8 см. Таўшчыня сценак 0,4–0,5 см. На шыйцы арнамент у выглядзе акруглых адціскаў, памерамі 0,4 см, нанесеных акруглай у сячэнні полай палачкай (трысцінкай?), альбо косткай. У якасці дамешак выкарыстана жарства памерамі 0,5–0,6 см і менш. Паверхня добра апрацаваная, гладкая. Колер вонкавай паверхні цёмна-карычневы з чорным, унутраная – чорнага колеру.

Мініяцюрны гаршчок (мал. 1, *2*) захаваўся амаль поўнасцю, невялікія страты ў верхняй частцы. Пасудзіна акругладонная, выцягнутай акруглай формы, з найбольшым расшырэннем тулава ў ніжняй частцы. Паверхня добра апрацаваная, гладкая. Колер вонкавай паверхні цёмна-карычневы з чорным. У якасці дамешак выкарыстана жарства.

Бранзалет, са сплаву медзі, пласцінкавы з заходзячымі разамкнутымі канцамі (мал. 1, *3*). Выраблены з пласцінкі авальнай ў сячэнні, дыяметр – каля 2,7 см, з заходзячымі разомкнутымі канцамі (мал. 1, *3*).

Бранзалет са сплаву медзі (мал. 1, *4*), пласцінчаты аканчэнні якога абламаны. Верагодней за ўсё канцы гэтага бранзалета таксама заходзілі адзін за адзін. Памерамі 3,2 см, пласціна авальная ў сячэнні.

Гаршкі (мал. 1, *1, 2*) блізкія па форме, памерах і арнаментацыі. Па метрычных паказчыках яны адносяцца да пасудзін сярэдніх памераў, паводле М. І. Лашанкова (2011, с. 240, 242). Пасудзіны такой формы часцей маюць меншыя памеры і іх адносяць да катэгорыі мініяцюрнага посуду (Лошенков, 2011, рис. 71, *10–12*; Мельниковская, 1967, рис. 49). Праўда можна адзначыць пэўныя аналогіі і сярод не мініяцюрных сасудаў. Такія гаршчкі вядомыя ў матэрыялах Мохаўскага I гарадзішча, гарадзішча Ліскі, а таксама на тэрыторыі Валыні і Пабужжа (Мельниковская, 1967, рис. 44, *25*, 50, *11–15*; Лошенков, 2011, рис. 69, *6*). В. М. Мельнікоўская падобны сасуд з Мохаўскага I гарадзішча датавала VI– IV стст. да н. э.

Прадстаўленыя вышэй бранзалеты (мал. 1, *3, 4*) з'яўляюцца аднымі з самых распаўсюджаных у арэале мілаградскай культуры (Лошенков, 2011, с. 206). Праўда падобныя ўпрыгажэнні вядомы і ў матэрыялах позняй бронзы (Бандрівський, 2014, рис. 127, *4*).

У пахаваннях мілаградскай культуры, яны сустракаліся на могільніку Малапалавецкае-3 (Фастаўскі р-н Кіеўская вобл.) (п. 178, 179) і Казаровічы (п. 4) (Лысенко, 2010, с. 194–195, рис. 10, *9, 11*; Петровская, Максимов, 2008, рис. 37, *4–7*). У адным з комплексаў апошняга былі выяўленыя адразу два такія бранзалеты. На падставе знаходкі мяча з пахаавння № 1 каля в. Казаровічы, можна канстатаваць той факт, што могільнік функцыянаваў у сярэдзіне VI – першая палове V ст. да н. э. (Бабенко, Шелехань, 2015). У пахаванні № 179 грунтовага могільніка Малапалавецкае-3 была выяўлена сіняя вочкавая пацерка. На думку М. І. Лашанкова імпартныя пацеркі траплялі да мілаградцаў у V–IV ст. да н. э. (2011, с. 237).

У інтэрпрэтацыі месцазнаходжання каля в. Баравікі я падтрымліваю меркаванне У. Ф. Ісаенка і Л. Д. Побаля, якія вызначалі яго як парушаны грунтовы могільнік мілаградскай культуры. Пры гэтым у тэксце справаздачы і публікацыі не згадваецца аб знаходках у Баравіках кальцыніраваных ці неперапаленых костак. Для мілаградскіх грунтовых крэмацыйных пахаванняў характэрна змяшчэнне паасобных костак, колькасць якіх як правіла вагаецца ад 1 і да 10 фрагментаў, вызначэнне якіх антраполагамі немагчыма. Трэба адзначыць што ў Атвержычах (Столінскі р-н Брэсцкая вобл.) (п. 33) быў выяўлены сасуд мілаградскай культуры, побач з якім косткі выяўлены не былі, што указвае на то што гэта кенатаф. Магчыма ў Баравіках таксама былі выяўлены кенатафы, ці падчас абследавання помніка косткі проста не былі заўважаны.

Найбольшую цікавасць прадстаўляе той факт, што сасуды былі знойдзены цэлымі. Вядома, што пахавальны інвентар мілаградцаў характарызуе невялікая колькасць рэчаў, наяўнасць у запаўненні ям костак жывёл, даволі часта таксама – мэтанакіраванае змяшчэнне камянёў у аб'ём ямы, ці побач з ёй (Мельниковская, 1967, с. 45–46). У пахаванні выключна рэдка змяшчаліся цэлыя пасудзіны – як правіла, гэта былі асобныя іх фрагменты (Мельниковская, 1962, с. 166). Аднак, М. І. Лашанкоў, назіраючы за пахавальным абрадам мілаградцаў на тэрыторыі Прыпяцкага Палесся, выказаў гіпотэзу, што ў дадзеным рэгіёне ў пахаванне як правіла ставілі цэлыя сасуды (Лашанкоў, 1997, с. 38). Пры гэтым можна адзначыць, што на Палессі вядомы толькі адзінкавыя пахаванні (Лашанкоў, 1997, с. 38). Напрыклад, у пахаванні з Пагоста (Жыткавіцкі р-н Гомельская вобл.) (мал. 2, 22) былі выяўлены толькі фрагменты керамікі.

Улічваючы невыразнасць выяўленых матэрыялаў, нельга вузка датаваць помнік каля в. Баравікі. У дадзеным выпадку мне падаецца




1 ▲; 2 △; 3 ■; 4 □; 5 ╎; 6 ╎

**Мал. 2.** Могільнікі Мілаградскай культуры на тэрыторыі Беларусі

**Умоўныя абазначэнні:**

*1* – даследаванныя курганы МК; *2* – курганы якія не даследаваліся, але ў літаратуры адносяцца да МК; *3* – помнікі з грунтовымі пахаваннямі МК; *4* – помнікі з рэшткамі пахаванняў культурна-храналагічнай інтэрпрытацыя якіх не дакладна; *5* – арэал МК па М. І. Лашанкову; *6* – арэал МК па А. А. Егарэйчанка.

**Подпісы да карты:**

*1* – Дубой; *2* – Бор Дубянецкі; *3* – Вулька Арэя; *4* – Вылазы; *5* – Прыбар; *6* – Атвержычы; *7* – Велемічы – 1; *8* – Давыд Гарадок; *9* – Заспа; *10* – Гарошкаў; *11* – Прысна; *12* – Ворнаўка; *13* – Мохаў – 1, 2, 4; *14* – Асарэвічы; *15* – Кісцяні; *16* – Горваль; *17* – Мілаград; *18* – Юркавічы; *19* – Буразі; *20* – Сямурадцы; *21* – Знаменка; *22* – Пагост; *23* – Обчын; *24* – Чаплін; *25* – Калочын; *26* – Праскурні; *27* – Ніжняя Алба; *28* – Баравікі; *29* – Любны; *30* – Янава; *31* – Ястрабка; *32* – Рэчыца – 2; *33* – Гарадок; *34* – Камарын; *35* – Шэрсцін – 2

лагічна датаваць яго ў межах існавання культуры, а менавіта VII–III ст. да н. э.

Падсумоўваючы, можна канстатаваць, што могільнік мілаградскай культуры каля в. Баравікі быў зруйнаваны падчас земляных прац у канцы 1950-х гг. Прысутнічаюць пэўныя разыходжанні паміж тэкстамі публікацый, справаздачы і матэрыяламі якія захоўваюцца ў музеях. Так, замест аднаго ў музеі Юравцкай сярэдняй школы знаходзіцца два бранзалеты. Не ўдалося высветліць месца захавання яшчэ аднаго цэлага сасуда, які быў знойдзены на плошчы помніка. Нельга дакладна сказаць колькі разбураных пахаванняў была выяўлена У. Ф. Ісаенка ў 1961 г. Адносна пахавальнага абраду можна выказаць дзве думкі: 1) пахаванні здзяйсняліся па абраду крэмацыі, а адсутнасць костак звязана з тым, што іх проста не заўважылі; 2) рэшткі разбуранных пахаванняў адносяцца да кенатафаў.

* * *

Бабенко, Л. та Шелехань, О., 2015. Кинджали з сегментоподібним перехрестям у зібранні Харківського історичного музею. *Археологія*, 4, с. 77–91.

Бандрівський, М., 2014. *Культурно-історичні процеси на Прикарпатті і Західному Поділлі в пізній період епохи бронзи – на початку доби раннього заліза*. Львів: Інститут українознавства ім. І. Крип'якевича НАН України.

Исаенко, В., 1962. *Отчет о полевых исследованиях, проведенных в 1961 г. в бассейне р. Припять*. ЦНА НАН Беларусі. ФАНД. Воп. 1. Арх. № 159.

Лашанкоў, М., 1999. Археалагічныя помнікі мілаградскай культуры. В: *Археалогія Беларусі: У 4 т.: Т. 2. Жалезны век і ранняе сярэднявечча.* Мінск: Беларуская навука, с. 29–39.

Лошенков, М., 2011. *Городища Милоградской культуры на территории Беларуси*. Минск: МФЦП.

Лысенко, С., 2010. Новые памятники подгорцевской группы милоградской культуры на Киевщине. *Археологія і давня історія України*, 4, с. 190–200.

Мельниковская, О., 1962. Могильник милоградской культуры в дер. Горошков в Южной Белоруссии. *Советская археология*, 1, с. 163–172.

Мельниковская, О., 1967. П*лемена Южной Белоруссии в раннем железном веке*. Москва: Наука.

Побаль, Л., 1993. Баравікі. В: В. В. Гетаў, У. Ф. Ісаенка [і інш.], рэд. *Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыклапедыя.* Мінск: БелЭН. с. 73–74.

Поболь, Л., 1983. *Археологические памятники Белоруссии. Железный век.* Минск: Наука и техника.

# GROUND CEMETERY OF MILOGRAD CULTURE NEAR V. BORAVIKA: SOME HISTORIOGRAPHICAL ISSUES

Aleh Sakhonchyk | PhD student, Belarusian State University

This article presents materials from a site near the village of Boroviki. The site was accidentally discovered in 1960 and examined in 1961 by V.F. Isayenko. Certain discrepancies are noted between the texts of the publications, the report and the materials kept in museums. Two thoughts are expressed with regard to the funeral rites of the revealed ruined graves.

**Keywords:** *Milograd culture, early Iron Age, funeral rites, cremation, cenotaph.*